**ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ**

***Болдак Д.А.***
*навучэнка 4 курса Ваўкавыскага каледжа УА "ГрДУ імя Янкі Купалы",*
*г. Ваўкавыск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Лазарчык Н.В., выкладчык

Творчасць Янкі Купалы – незгасальная крыніца натхнення для любога пакалення. З яго вершамі дзеці знаёмяцца, пачынаючы з 2 класа. Вершы паэта ўжо на працягу многіх дзесяцігоддзяў нясуць маленькім чытачам глыбокі адукацыйны, развіццёвы і выхаваўчы патэнцыял. Настаўнікі пачатковай школы прапануюць шэраг прыёмаў для вывучэння вершаў паэта, каб яны заўжды былі актуальнымі і зразумелымі дзецям. Таму мэта даследавання – прадэманставаць спектр прыёмаў вывучэння творчасці Янкі Купалы ў пачатковай школе.

**Асноўная частка.** У час вывучэння творчасці паэта вучням 3 класа прапанавалася адказаць на пытанні анкеты для выяўлення ведання вучнямі творчасці аўтара:

1. Хто такі Янка Купала?
2. Якія творы яго вы вывучалі, чыталі?
3. Які настрой перадаецца ў творах паэта?

У анкетаванні ўдзельнічалі 22 вучні. На першае пытанне ўсе дзеці (100%) адказалі правільна. На другое пытанне 9 вучняў (40%) назвалі ўсе вершы, 6 вучняў (27%) назвалі 3 вершы, 5 вучняў (23) узгадалі 2 вершы, а 2 навучэнцы (10%) успомнілі толькі 1 верш. Гэтыя паказчыкі сведчаць пра сярэдні ўровень ведання творчасці паэта. Пры адказе на апошняе пытанне вучні даволі дакладна апісалі эмоцыі, што перадаюцца ў творах. Напрыклад, у вершы "Хлопчык і лётчык" дзеці адзначылі летуценны настрой, перадачу шчырага жадання хлопчыка ажыццявіць сваю мару. Такім чынам, эмацыянальны настрой твораў навучэнцы разумеюць добра. Для навучэнцаў Ваўкавыскага каледжа спецыяльнасці "Пачатковая адукацыя" таксама былі прапанаваны пытанні анкеты:

1. Якія творы Янкі Купалы вы ведаеце?
2. Які ўклад паэт унесла ў дзіцячую літаратуру?
3. Што мае на мэце вывучэнне твораў паэта?

У анкетаванні ўдзельнічалі 43 навучэнцы 4 курса. Пры адказе на першае пытанне ўсе навучэнцы назвалі творы паэта для абавязковага вывучэння ў пачатковай школе, а таксама ўзгадалі паэмы "Бандароўна", "Магіла льва", п'есы "Раскіданае гняздо", "Паўлінка" і іншыя, што сведчыць пра добрае веданне твораў паэта. Пры адказе на другое пытанне навучэнцы адзначалі, што паэт аздобіў беларускую дзіцячую літаратуру творамі на тэму мараў дзіцяці, важнасці прафесій, патрыятызму, мастацтва, захаплення роднай прыродай. Пры адказе на трэцяе пытанне навучэнцы адзначалі, што творы паэта вучаць дзяцей ставіць мэты і дасягаць іх, разумець важнасць прафесій, любіць і берагчы Радзіму, усведамляць эстэтычную каштоўнасць мастацкага слова, берагчы родную прыроду, ведаць гісторыю свайго народа. Відавочна, што адукацыйны і выхаваўчы змест твораў Янкі Купалы зразумелы для будучых настаўнікаў.

Верш "Хлопчык і лётчык", які яскрава, шчыра, глыбока адлюстроўвае тэму дзіцячых летуценняў, стаў ужо хрэстаматыйным творам. Пры вывучэнні твора мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя прыёмы работы:

- падбор асацыяцый да загалоўка верша;
- гульня "Рассыпаны верш": прачытайце моўчкі, паспрабуйце аднавіць гэты верш і з дапамогай палосак выкладзіце правільную паслядоўнасць строф;
- слоўнікавая работа;
- падбор сінонімаў. Да слоў "надакучыла", "блукае" падбярыце словы з блізкім значэннем. (Надакучыла – стала сумна, блукае – бязмэтна ходзіць, гуляе);
- праблемныя пытанні: Чаму хлопчыку захацелася адправіцца ў палёт? Знайдзіце адказ у творы. Растлумачце выраз "іншы парадак і лад". У якім значэнні ўжыта слова "месяц"? Якія

Репозиторий ВГУ

ветлівыя словы мог бы выкарыстаць хлопчык?) Знайдзіце ў вершы словы, што дапамаглі замяніць гэтыя выразы?

- рэха-чытанне (настаўнік чытае радок, а вучні той жа радок, толькі цішэй, як быццам рэха);
- падарожжа (па мясцінах, згаданых у творы);
- выбарачнае чытанне. Знайдзіце радок з верша і зачытайце, як хлопчык хоча апынуцца ў беларускім лесе. Што ён там хоча ўбачыць?
- камбінаванае чытанне (адзін радок чытае адзін вучань, а другі ўсе астатнія);
- чытанне "пеўнікам" (вучні апускаюць вочы, чытаюць моўчкі адзін радок, а затым паднімаюць вочы і прагаворваюць гэты радок і т.д.);
- стоп-чытанне (чытае адзін вучань, настаўнік гаворыць "стоп", вучань называе імя другога вучня, які працягне чытаць);
- чытанне па ланцужку;
- самастойнае чытанне трэцяй і чацвёртай строф верша з заданнем: падрыхтавацца да слоўнага малявання на тэму "Што хацеў убачыць хлопчык?"
- слоўнае маляванне. Зачытайце радкі, у якіх гаворыцца пра тое, што хацеў убачыць хлопчык. Што перадае кожны радок? (Асобны малюнак.) Паспрабуйце зрабіць яго больш яркім і поўным. Калі ў вас ёсць цяжкасці можна карыстацца наступнымі выразамі: цёмнае, начное, зорнае (неба), жоўты, халодны, серабрысты (месяц), цёмна-зялёны, непраглядны (гушчар), яркія, бліскучыя, далёкія (зоры), імклівыя, блакітныя, шырокія (рэчкі);
- рэле-чытанне (адзін радок вучань чытае ўслых, другі моўчкі, трэці ўслых і т.д.) [1].

У трэцім класе вывучаецца верш "Лістапад", які апісвае змены ў прыродзе восенню. Пры яго вывучэнні мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя прыёмы:

- лексічная работа з назвай верша;
- слоўнае маляванне;
- складанне параўнальнай табліцы па вершы (прырода восенню і прырода вясной);
- гульня "Колеры прыроды": 2 каманды падбіраюць колеры восені і вясны;
- паведамленні пра дрэвы, згаданыя ў вершы;
- параўнанне верша з творам музыкі ці мастацтва;
- прагназаванне: па назве твора прапанаваць змест твора.

У чацвёртым класе вывучаецца верш "Песня і казка", прысвечаны цудадзейнай сіле мастацтва. Пры яго вывучэнні прапануюцца наступныя прыёмы работы:

- лексічная работа з абодвума паняццямі;
- падбор вядомых дзецям песень і казак, вызначэнне іх выхаваўчага зместу;
- праблемныя пытанні: "Чаму песня і казка ходзяць параю? Якія таямніцы яны пакажуць свету? Чаму яны намячаюць шлях людзям да зораў?";
- чытанне "Галава – хвост": настаўнік пачынае чытаць сказ, вучні знаходзяць і чытаюць;
- чытанне "Хованкі": знайсці слова з пэўнай характарыстыкай;
- чытанне ўрыўка, да якога можна падабраць прыказку;
- знаходжанне ўрыўка, які трэба прачытаць (весела, сумна, трывожна);
- чытанне "за дыктарам".

**Заключэнне**. Такім чынам, пры вывучэнні твораў Янкі Купалы выкарыстоўваюцца разнастайныя прыёмы чытання, што садзейнічаюць лепшаму ўспрыняццю верша, фарміраванню паўнацэннага навыку чытання. Прымяненне шэрагу прыёмаў спрыяюць актывізацыі пазнавальнай дзейнасці, развіццю дывергентнага мыслення, вуснай звязнай мовы, пашырэння актыўнага слоўніка вучняў.

**Літаратура**

1. План-канспект урока па літаратурнаму чытанню // Инфоурок [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://infourok.ru/plankanspekt-uroka-pa-litaraturnamu-chitannyu-3123152.html. – Дата доступу: 01.04.2021.

Рэпазіторый ВГУ